10. Инженерно-технические силы в профдвижении Белоруссии // Праф. рух Беларусі. – 1926. – № 8. – С. 8.

11. Отчет Центрального совета профсоюзов Белоруссии за период декабрь 1925 г. – июнь 1927 г.: к VI Всебелорусскому съезду профсоюзов. – Минск: [б. и.], 1927. – 117 с.

12. Самакальны. З’езд інжынераў і тэхнікаў Беларусі / Самакальны // Праф. рух Беларусі. – 1928. – № 12. – С. 1–3.

13. Рэзалюцыі III Усебеларускага з’езду інжынерна-тэхнічных работнікаў (19–22 мая 1928 г.) і пастанова IV Пленуму ЦСПСБ аб выніках з’езду ІТР і далейшай рабоце інжынерна-тэхнічных секцый (8–9 чэрвеня 1928 г.). – Мінск: ЦСПСБ, 1928. – 39 с.

14. НАРБ. – Фонд 44. – Оп. 1. – Д. 1820.

15. НАРБ. – Фонд 276. – Оп. 1. – Д. 230.

16. Государственный архив Гомельской области. – Фонд 249. – Оп. 1. – Д. 5.

17. Пыстина, Л. И. Льготы и привилегии интеллигенции в советской России в 1920-е годы (проблемы изучения) / Л. И. Пыстина // Гуманитарные науки в Сибири. – 1999. – № 2. – С. 31–34.

18. НАРБ. – Фонд 265. – Оп. 1. – Д. 2563.

19. НАРБ. – Фонд 266. – Оп. 1. – Д. 13.

20. *Мількамановіч, І.* Да вынікаў Усебеларускай канферэнцыі інжынерна-тэхнічных работнікаў / І. Мількамановіч // Праф. рух Беларусі. – 1929. – № 11. – С. 8–9.

21. НАРБ. – Фонд 265. – Оп. 1. – Д. 2436.

22. НАРБ. – Фонд 294. – Оп. 1. – Д. 142.

23. *Процька, Т. С.* «Беларускі філіял Прампартыі» / Т. С. Процька // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск, 1993–2003. – Т. 1. – 1993. – С. 455–456.

**(Дата подачи: 18.02.2020 г.)**

*А. М. Дулаў*
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск

*A. M. Dulau*
Vitebsk State University Named after P. M. Masherov, Vitebsk

**УДК 94(476)“1921/1929”:338.43–055.2**

# ЖАНЧЫНЫ У СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ СЕКТАРЫ ЭКАНОМІКІ БССР (1920-Я ГГ.)

# WOMEN IN THE AGRICULTURAL SECTOR ECONOMY OF THE BSSR (1920S)

*Прааналізаваны асаблівасці занятасці жанчын і іх роля ў сельскагаспадарчым сектары эканомікі БССР у 1920-я гг. Паказана ўключэнне жанчын у сялянскія таварыствы ўзаемадапамогі і вытворчую кааперацыю. Раскрыта спецыфіка жаночай працы ў калектыўных гаспадарках у перыяд нэпа, а таксама акрэслены формы жаночага пратэсту супраць фарсіраванай калектывізацыі.*

*Ключавыя словы: жанчыны; сялянкі; занятасць; праца; нэп, сельская гаспадарка; калгасы; яслі; калектывізацыя.*

*The features of women's employment and their role in the agricultural sector of the economy in the 1920s are analyzed. The inclusion of women in industrial cooperation is shown. The specificity of female labor in collective farms during the NEP period is disclosed, and forms of female protest against forced collectivization are determined.*
*Keywords: women; peasant women; employment; labor; NEP; agriculture; collective farms; nurseries; collectivization.*

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Савецкая ўлада першай у свеце распачала спробу ажыццяўлення на дзяржаўным узроўні жаночай эмансіпацыі і пераўтварэння сістэмы адносін паміж мужчынам і жанчынай, кіруючыся задачамі пабудовы сацыялізму і тэарэтычнымі ідэямі марксісцкага фемінізму. Першыя кіраўніцы створанага ў 1919 г. жанаддзела пры ЦК РКП(б) І. Арманд і А. Калантай бачылі шлях да вырашэння жаночага пытання не столькі ў пашырэнні палітычных правоў жанчын, колькі ва ўключэнні іх у грамадскую вытворчасць праз стварэнне дзяржаўнай сістэмы бытавога абслугоўвання і выхавання дзяцей, што вызваляла б жаночае насельніцтва ад цяжару хатніх клопатаў. Рэалізацыя бальшавіцкага эмансіпацыйнага праекта была заклікана спрыяць уключэнню жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва і ломцы патрыярхатных асноў традыцыйнага грамадства [1, с. 243–247]. Але на практыцы зрабіць гэта было зусім нялёгка па шэрагу прычын.

У беларускай савецкай гістарыяграфіі акцэнт быў зроблены на грамадска-палітычнай працы КП(б)Б сярод сялянак, уцягненні іх у калгаснае будаўніцтва (В. Сарокіна, М. Партнова і інш.). У постсавецкі час да праблемы гендарных адносін у беларускай вёсцы 1920-х звяртаўся І. Куркоў, у працах якога ў новым ракурсе была прадстаўлена грамадска-палітычная актыўнасць вясковых жанчын і стаўленне да гэтага іх мужоў і партыйных кіраўнікоў [2; 3]. Даследчык таксама раскрыў інфармацыйны патэнцыял дакументаў ЦК КП(б)Б як крыніц пра змены ў становішчы сялянак падчас калектывізацыі і іх рэакцыю на яе [4]. Зрухі ў характары занятасці жанчын у сельскагаспадарчай вытворчасці, найперш у 1930-я гг., паказалі У. Навіцкі [5] і А. Дулаў [6; 7]. Важным уяўляецца раскрыць асаблівасці занятасці і ролю жанчын у сельскагаспадарчым сектары эканомікі БССР у 1920-я гг. Гэтаму і прысвечаны наш артыкул.

Крыніцамі паслужылі матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўных архіваў Віцебскай і Мінскай абласцей, а таксама публікацыі ў тагачасным перыядычным друку БССР. Ужываліся агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя) і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны) метады.

Большая частка насельніцтва БССР у 1920-я гг. пражывала на вёсцы і была занятая ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Пераважнай сферай прымянення працы сялянак на працягу 1920-х гг. па-ранейшаму была ад-

наасобная гаспадарка. Сям'я працягвала выконваць вытворчыя функцыі, з'яўлялася асноўнай гаспадарча-эканамічнай ячэйкай. Тут захоўваўся традыцыйны падзел работ на «мужчынскія» і «жаночыя». Уся праца ў хаце і ў агародзе, бытавое абслугоўванне мужчыны лічылася справай жаночых рук. Мужчыны займаліся ў асноўным палявымі работамі, хоць і тут не абыходзілася без дапамогі жанчын, напрыклад, пры ўборцы ўраджаю. Аднак у 1920-я гг. шматлікім жанчынам, мужы якіх загінулі на вайне ці сталі інвалідамі, даводзілася самастойна весці гаспадарку [6, с. 40].

У гэтых умовах у перыяд нэпа важнай формай развіцця жаночай актыўнасці сталі Сялянскія камітэты грамадскай узаемадапамогі (з 1924 г. – Сялянскія таварыствы ўзаемадапамогі; далей – СТУ). Мэтай СТУ было паляпшэнне сацыяльнага забеспячэння сялян і сем'яў чырвонаармейцаў і развіццё на гэтай аснове ў сялянства калектывісцкіх пачаткаў. За кошт членскіх узносаў і даходаў са сваіх прадпрыемстваў СТУ аказвалі дапамогу бедным сялянам грашыма і насеннем, матэрыяльна падтрымлівалі школы, хаты-чытальні, садзейнічалі каапераванню сялянскіх гаспадарак. Сур'ёзны колькасны рост таварыстваў намеціўся ў БССР у 1925/26 г. [8, с. 42]. Ён быў дасягнуты ў значнай ступені за кошт калектыўна-добраахвотнага членства, гэта значыць у арганізацыю уступалі цалкам вёскі і пасёлкі. Колькасць жанчын у СТУ на працягу 1920-х гг. пастаянна расла (ад 5 % у 1925 г. да 20 % у 1929/30 г.) [8, с. 45, 48].

Аб прадстаўніцтве жанчын у кіраўніцтве гэтай арганізацыі сведчаць наступныя дадзеныя. ЦК СТУ, абраны ў 1925–1926 гг., складаўся з 31 чалавека. У яго ўваходзілі 2 жанчыны. Па 10 акруговых камітэтах было абрана 190 чалавек (з іх 24 жанчыны), а па 100 раённых камітэтах – 1484 чалавека (з іх 164 жанчыны) [8, с. 43]. Калі камітэты СТУ ў 1925/26 г. узначалілі 20 жанчын, то пасля выбараў 1929/30 г. старшынямі вясковых камітэтаў сталі працаваць 73 жанчыны, раённых – 12 [8, с. 44, 49]. У 1930 г. у сувязі з калектывізацыяй СТУ спынілі сваё існаванне. Замест іх у калгасах ствараліся касы ўзаемадапамогі.

Вялікае значэнне надавалася ў 1920-я гг. уключэнню жанчын у разнастайныя формы кааперацыі. Як пісаў часопіс «Кааперацыйнае жыццё», «вовлекая трудящихся женщин в кооперацию, привлекая их к активному в ней участию, мы тем самым толкаем эту женскую массу к политической активности и применению на деле своей общественной энергии» [9, с. 8]. Акрамя таго, сцвярджалася, што ўдзел у якасці пайшчыц у працы кааперацыі спрыяе барацьбе дзяржавы з рынкам, а таксама дае магчымасць ажыццяўлення «новага быту» у рабочай і сялянскай сям'і. Але ў сельскай мясцовасці ўдзел жанчын у спажывецкай кааперацыі быў слабым: на 1 студзеня 1925 г. доля іх складала ўсяго 3,6 % [10, спр. 5, арк. 91]. У далейшым колькасць жанчын-пайшчыц у кааперацыі і жанчын у праўленнях таварыстваў некалькі вырасла, але кааператыўныя работнікі на месцах з недаверам ставіліся да

сялянак; часта абранне жанчын у кіруючыя органы кааперацыі праводзілася фармальна, ніякай практычнай нагрузкі яны не атрымлівалі.

Асаблівае значэнне дзяржава надавала развіццю вытворчай кааперацыі. На 1 сакавіка 1924 г. у БССР існавала 8 камун, 53 арцелі, 136 сельскагаспадарчых таварыстваў і 197 першасных кааператыўных аб'яднанняў. У іх уваходзілі 2095 чал. Ва ўсіх гаспадарках (без Барысаўскага павета) налічвалася 459 працаздольных жанчын на 536 працаздольных мужчын [11, с. 178–179]. На 1 лістапада 1927 г. у БССР налічвалася ўжо 994 калектыўных гаспадаркі (з іх 764 арцелі, 69 камун і 161 таварыств па сумеснай апрацоўцы зямлі), у якіх налічвалася 44 614 чал., у тым ліку 49,7 % жанчын [7, с. 323].

Праведзеныя ў 1927/28 г. жанаддзелам ЦК КП(б)Б выбарачныя абследаванні працы сярод жанчын і становішча іх у грамадскіх гаспадарках, якія ахапілі больш за 20 сельгасарцеляў і камун Аршанскай, Магілёўскай, Бабруйскай і Мазырскай акругаў, выявілі, што жаночая праца займае ў іх нязначнае месца і носіць, галоўным чынам, сезонны характар. Традыцыйны падзел працы быў характэрны і для грамадскіх гаспадарак. Толькі ў некаторых камунах, напрыклад, «Світанак» Аршанскай акругі, жывёлагадоўля цалкам ўскладалася на жанчын. У астатніх гаспадарках сялянкі ў асноўным займаліся хатняй гаспадаркай і выконвалі пэўныя дапаможныя працы. Звычайна жанчын не дапускалі да механізаванай працы. Нават калі ў калгасах меліся машыны, якія замянялі традыцыйную ручную працу жанчын (жняяркі, снопавязалкі і інш.), то на іх працавалі мужчыны. Узровень заработнай платы калгасніц быў на 20–50 % ніжэйшы. Праўда, у асобных калгасах існавала (ці, па меншай меры, дэкларавалася) роўная аплата працы. Так было, напрыклад, у калгасах «Свабодная праца» і «Роўнасць» Бабруйскай акругі. На курсы па павышэнні кваліфікацыі дасылаліся выключна мужчыны. Трэба адзначыць, што жанчыны-калгасніцы не імкнуліся да актыўнага ўдзелу ў калектыўнай працы, кажучы: «нам няма часу, нам хватае работы ў хаце» [10, спр. 105, арк. 32].

У кіраўніцтве калгасаў распаўсюджана было меркаванне, што калі не хопіць жаночай рабочай сілы, то яе лепш наняць, бо гэта танней. Наём жаночай рабочай сілы даволі шырока ўжываўся ў гаспадарках, асабліва ў летні час. Так, у яўрэйскай арцелі «Орта» Магілёўскай акругі восенню 1927 г. 28,5 гектараў бульбы з 30 было прыбрана наёмнымі сялянкамі. У сярэднім на ўвесь сезон працы ў арцелі прыходзілася 840 наёмных працадзён, што складала 20 % ад іх агульнай колькасці [7, с. 323].

Адзінокія жанчыны і ўдовы рэдка станавіліся членамі грамадскіх гаспадарак. Так на 131 калгас Бабруйскай акругі, пры значнай колькасці жадаючых, толькі 5 жанчын змаглі самастойна ўступіць у калгасы. Шмат у чым гэта было звязана з тэндэнцыяй з боку кіраўніцтва не прымаць бядняцкіх гаспадарак на чале з жанчынамі і адзіночак-батрачак. У калгасе «ЭРД» на Бабруйшчыне рашэнне аб забароне прыёму ўдоў, дзяўчат і мужчын-

халасцякоў было прынята і дакументальна аформлена на сходзе членаў калектыву [10, спр. 165, арк. 43].

Прынцып раўнапраўя, узаконены бальшавікамі яшчэ ў 1917 г., парушаўся і ў іншых выпадках, уступаючы ў супярэчнасць з нормамі і стэрэатыпамі патрыярхатнай культуры. Напрыклад, калі калгаснік ажаніўся з сялянкай-аднаасобніцай, то яна аўтаматычна станавілася членам калектыву. Калі ж калгасніца выходзіла замуж за бедняка ці парабка, які жадаў ўступіць у калгас, яго звычайна прымалі на агульных падставах [7, с. 324].

Хоць фармальна ў гэты перыяд большасць калгасаў перайшла на індывідуальнае членства, фактычна па-ранейшаму на сходах значэнне мела толькі меркаванне кіраўніка сям'і. Інспектары адзначалі, што нават у лепшых калгасах, дзе жанчыны праяўлялі актыўнасць («Ніва» Бабруйскай акругі), іх запрашалі толькі на асобныя «важныя» сходы, а пры вырашэнні штодзённых пытанняў прысутнічалі толькі мужчыны [10, спр. 165, арк. 44]. З іншага боку, здаралася, што жанчыны не хацелі або не мелі магчымасці ўдзельнічаць у сходах, бо былі занятыя хатняй гаспадаркай.

Жаночае прадстаўніцтва ў кіруючых органах арцеляў і камун было зусім нязначным. У складзе саветаў і праўленняў 16 абследаваных гаспадарак толькі ў 37 % мелася па адной жанчыне. У астатніх жанчын не было. Ды і членства жанчын у органах кіравання было, як правіла, фармальным, і ніякай працы яны не выконвалі. Выключэннем з'яўлялася камуна імя Карла Маркса Магілёўскай акругі, якую стварыла і на працягу двух гадоў узначальвала сялянка Брытава, якая карысталася аўтарытэтам як сярод камунараў, так і сярод вяскоўцаў [10, спр. 165, арк. 45, 47].

Сітуацыя, калі значная частка патэнцыйнай рабочай сілы не прымала ўдзелу ў калектыўнай працы, выклікала заклапочанасць і спробы яе вырашэння. Аднак у разглядаемы час акрэсленая праграма вызвалення жанчын ад хатняй працы шляхам стварэння разгалінаванай камунальна-бытавой інфраструктуры знаходзілася ў самым пачатку рэалізацыі. У абследаваных ў 1927/28 г. гаспадарках, за выключэннем дзвюх камун, не было ні агульнай кухні, ні пральні, ні швейнай майстэрні, ні ўдасканаленых ткацкіх станкоў [10, спр. 165, арк. 45–46]. Не лепшым чынам ішла справа і з дзіцячымі ўстановамі. У сельскай мясцовасці ў летні час ладзіліся сезонныя палявыя яслі і дзіцячыя пляцоўкі, але іх было мала. Разгортванне сеткі дашкольных устаноў стрымлівалася недахопам кадраў. Працаўнікоў для сельскіх ясляў навучалі на 6-тыднёвых курсах у акруговых гарадах. Нязначным было дзяржаўнае фінансаванне. Грошы са сваіх бюджэтаў вылучалі і ведамствы, але, хутчэй, сімвалічна: ў 1929 г. на арганізацыю ў калгасах 21 сада-ясляў Белкаапсаюз, Наркамасветы і Наркамздраў накіравалі 32 тыс. рублёў [12, с. 6]. Але і тыя сціплыя сродкі, якія вылучаліся дзяржавай, выкарыстоўваліся дрэнна. Напрыклад, пры камунах «Світанак» і «Араты» Аршанскай акругі ў 1924/25 г. існавалі яслі, адкрытыя на сродкі дзяржбюджэту. Аднак яны не

былі пераведзены на ўтрыманне калгасаў і спынілі сваё існаванне. Падобныя выпадкі здараліся нярэдка. Жанчыны падчас палявых работ вымушаны былі браць дзяцей з сабой або пакідаць на апеку бабуль, старэйшых дзяцей ці нават наёмных нянь [10, спр. 159, арк. 4].

З іншага боку, спробы арганізаваць яслі ў вёсках напачатку нярэдка сустракалі недавер і супрацьдзеянне саміх сялянак. Распаўсюджваліся чуткі, накшталт: «дзяцей у яслях б’юць», «павялічаць падатак таму, хто будзе аддаваць дзяцей у яслі» [13, с. 21]. Многія сялянкі лічылі, што «деревенским детям не нужны игрушки и книги, а нужно, чтобы они умели работать», «если давать детей в ясли и сады, то они выйдут оттуда лентяями и белоручками и не будет кому работать» [14, спр. 183, арк. 15]. У некаторых выпадках сялянкі і хацелі б аддаць дзяцей у яслі, але не маглі гэта зрабіць, таму што, паводле іх тлумачэння, не мелі 2–3 метра паркалю, каб пашыць адзенне дзіцяці [15, с. 11]. Пераламаць негатыўныя адносіны да ясляў імкнуліся праз дэлегацкія сходы. У вёсцы Моч сялянкі рашыліся аддаць дзяцей у яслі толькі пасля таго, як гэта зрабілі дэлегаткі [13, с. 21]. Але нярэдка іх намаганні перакрэслівае непрадуманыя дзеянні саміх савецкіх работнікаў. Ваенкам Дабрамыслянскай валасці Віцебскага павета, напрыклад, раз’язджаў па вёсках з пагрозамі расстраляць тых, хто не аддасць дзяцей у яслі [14, спр. 183, арк. 15].

Аб’ектыўныя і суб’ектыўныя цяжкасці тлумачаць, чаму на тэрыторыі БССР ў 1924 г. налічвалася ўсяго 14 сезонных палявых ясляў [10, спр. 6, арк. 5, 11]. У далейшым становішча некалькі палепшылася. У 1930 г. колькасць сезонных і пастаянных ясляў ўзрасла да 1250, але і гэтага было недастаткова. На вёсцы самі сялянкі вымушаныя былі браць на сябе значную частку клопатаў па ўтрыманні ясляў і пляцовак. У многіх выпадках сродкі бацькоў прыцягваліся для арганізацыі харчавання. Прэса таго часу паведамляла, што сялянкі штодзень прыносілі малако, дровы для гатавання абедаў, ездзілі па чарзе па прадукты ў кааперацыю [13, с. 21]. Далёка не ўсе былі згодныя гэта рабіць.

Недастатковае дзяржаўнае фінансаванне, з аднаго боку, недаацэнка кіраўніцтвам шэрагу рэспубліканскіх органаў, прадпрыемстваў, сельсаветаў і райвыканкамаў значэння ясляў і дзіцячых садоў як устаноў, якія ствараюць умовы для эфектыўнага выкарыстання жаночай працы, не дазволілі дашкольнай сетцы заняць у 1920-я гг. належнае месца ў сацыяльна-бытавой інфраструктуры вёскі, у масавым парадку вызваліць жанчын у мэтах уключэння іх у вытворчую і грамадская-палітычную дзейнасць.

Значная частка сялянак адмоўна ўспрыняла палітыку фарсіраванай калектывізацыі, актыўна пратэстуючы супраць абагульвання маёмасці і раскулачвання. Пратэст жанчын набываў разнастайныя формы. Распаўсюджваліся антыкалгасныя чуткі, напрыклад, зімой 1930 г. у Амнішэўскім польскім нацыянальным савеце Плешчаніцкага раёна жан-

чыны расказвалі сялянам, што «вясною прыдуць палякі і ўсіх каляктывістаў пераколюць шампаламі, аб тым, што каляктывістаў будуць кляйміць...» [16, спр. 1213, арк. 317].

Нярэдка сялянкі зрывалі сходы па арганізацыі калгасаў. Як сведчыць інфармацыйны даклад у ЦК КП(б)Б аб ходзе калгаснага будаўніцтва і падрыхтоўцы да веснавой пасяўной кампаніі па Мінскай акрузе, датаваны сакавіком 1930 г., у шэрагу вёсак практычна ва ўсіх раёнах (Барысаўскім, Заслаўскім, Койданаўскім, Самахвалавічскім і інш.) жанчыны зрывалі сходы, супраціўляліся абагульванню жывёлы [16, спр. 1213, арк. 235].

Часта пратэст жанчын быў вельмі эмацыйны. У данясенні аб выніках агітпахода часцей 8 стралковай дывізіі ў лютым 1930 г., накіраваным у ЦК КП(б)Б, прыводзіліся характэрныя выпадкі антыкалгасных выступленняў жанчын: «в д. Юзефон (відавочна, Юзэфава. – *А. Д.*) целиком почти собрание женщин плакало, когда докладчик предлагал обобществить коров. На сходе в д. Рыня появилась женщина, которая, раскрыв тулуп, оказалась совершенно голая, заявив: "мы все голые и в колхозы не можем идти". В д. Емельян Мост жена председателя комитета взаимопомощи Агафья Бородина открыто выступала против колхозов, и за ней идет большинство женщин деревни. На сходе бедноты, во время записи в колхоз ее мужа, вышла на середину избы с истерическими криками: "не надо колхозов" и упала на пол. Ее выходка чуть ли не сорвала собрание бедноты» [цыт. па: 2, с. 26].

Жаночы пратэст мог выяўляцца ў форме пагроз на адрас калектывізатараў і нават фізічнага ўздзеяння на іх. У такіх выпадках жанчыны дзейнічалі групамі. Пісьменнік І. Барашка ў сваіх журналісцкіх «Нарысах з фронту калектывізацыі», апублікаваных у 1930 г. у часопісе «Маладняк», прыводзіць аповед камуніста М. Шырко. Апошні быў накіраваны для стварэння калгаса ў Свяцкі сельсавет Бабруйскай акругі. Спрабуючы пагутарыць з групай сялянак, ён сутыкнуўся з іх агрэсіўнымі паводзінамі. Жанчыны акружылі калектывізатара, калі даведаліся пра мэту яго прыезду, пачалі штурхаць, загучалі крыкі: «Далоў калгас – забіць камуніста!». Аднак М. Шырко трымаўся спакойна і ўпэўнена, быў перакананы ў сваёй праваце, што дапамагло супакоіць і сялянак [17, с. 118–119].

Распаўсюджанай формай пратэсту былі спробы жанчын вярнуць абагуленую маёмасць (збожжа, жывёлу). Е. І. Дзянісава (1915 г. н.) была сведкай такой спробы ў адной з вёсак Віцебскага раёна. Паміж яе бацькамі адбылася сварка: маці патрабавала, каб бацька забраў з калгаса дзвюх кароў і каня, ён жа адказаў: «… Не для того нас сюда согнали, чтобы нас обратно пустить на волю!» Маці прывяла жывёлу. На наступны дзень прыехала раённае начальства і ДПУ. Усё прыйшлося вярнуць у калгас. Разбіралі маёмасць толькі жанчыны, але ў якасці завадатараў былі затрыманы двое сялян. Жанчыны пакараны не былі [18]. Часта сялянкі групамі спрабавалі абараніць раскулачаных ад высылкі [14, спр. 764, арк. 248–249].

У савецкай гістарыяграфіі зацвердзіўся сфармуляваны яшчэ І. Сталіным тэзіс пра тое, што жанчыны выступалі супраць калектывізацыі не па ўласнай ініцыятыве, а ў сілу цемры і малапісьменнасці дзейнічалі па ўказцы кулакоў [19, с. 60]. Наўрад ці з гэтым можна пагадзіцца. Хутчэй, жаночы пратэст быў цалкам усвядомленым: сялянкі не бачылі неабходнасці стварэння калгасаў, турбаваліся пра будучыню сям'і і не жадалі аддаваць у гаспадарку сваю маёмасць, расставацца з каровамі, свіннямі, курамі, якія з'яўляліся крыніцай існавання. Жанчыны не разумелі неабходнасці высылкі кулакоў, якія нічога дрэннага не зрабілі, спачувалі ім. Таксама наўрад ці справядліва казаць пра наяўнасць гендарнага антаганізму ў беларускай вёсцы і пра тое, што мужчыны былі больш схільныя да ўдзелу ў мерапрыемствах савецкай улады [2, с. 26]. Сяляне, якія звыкліся весці гаспадарку самастойна, у большасці адчувалі тыя ж самыя пачуцці, што і іх жонкі, але звычайна не пратэставалі адкрыта, бо выступам мужчын карныя органы схільны былі надаваць палітычную афарбоўку, у той час як да пратэсту жанчын ставіліся не гэтак сур'ёзна і наступствы для іх былі куды больш мяккімі.

Частка жанчын-батрачак і беднячак, як і мужчын, станоўча ўспрынялі калектывізацыю, удзельнічалі ў раскулачванні, станавіліся членамі сельсаветаў, праўленняў калгасаў і нават іх старшынямі [7, с. 324]. Затым жыццё прымусіла змірыцца з калгасамі і астатніх жанчын.

Такім чынам, у 1920-я гг. бальшавіцкі эмансіпацыйны праект сутыкнуўся з традыцыйнымі асновамі грамадства і патрыярхальнай свядомасцю сялянскага насельніцтва БССР. Галоўнай эканамічнай ячэйкай на вёсцы заставалася сям'я, у якой існаваў падзел працы на «мужчынскую» і «жаночую». У перыяд нэпа ўлады надавалі вялікае значэнне ўключэнню жанчын у сялянскія таварыствы ўзаемадапамогі і разнастайныя формы кааперацыі. Аднак на практыцы адзінокія жанчыны падвяргаліся дыскрымінацыі пры прыёме ў калгасы.

У калектыўных гаспадарках 1920-х гг. жаночая праца займала нязначнае месца і мела пераважна сезонны характар. Традыцыйны гендарны падзел работ захоўваўся. Жанчыны не дапускаліся да працы з сельгасмашынамі, а іх заробак, як правіла, быў ніжэйшы, чым у мужчын. Нярэдка самі жанчыны не імкнуліся да ўдзелу ў калектыўнай вытворчасці, бо на іх плячах ляжалі праца ў хатняй гаспадарцы і догляд за дзецьмі. Нізкім было прадстаўніцтва жанчын у кіраўнічых органах камун і арцеляў, а асабліва – сярод старшыняў.

Фарсіраваную калектывізацыю значная частка сялян, як жанчын, так і мужчын, успрынялі адмоўна. Сялянкі выказвалі незадаволенасць у разнастайных формах: распаўсюджванне антыкалгасных чутак, зрывы сходаў, пагрозы і фізічнае ўздзеянне на калектывізатараў, вяртанне абагуленай маёмасці, спробы абараніць раскулачаных.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Чикалова, И. Р.* И. Арманд и А. Коллонтай: феминизм, коммунизм и женский вопрос в послереволюционной России / И. Р. Чикалова // Женщины в истории: возможность быть увиденными: сб. науч. ст. Вып. 2 / гл. ред. И. Р. Чикалова. – Минск: БГПУ, 2002. – С. 241–250.

2. *Курков, И.* Гендерный строй белорусской деревни в 20-е гг. / И. Курков // Иной взгляд: международный альманах гендерных исследований / гл. ред. И. Р. Чикалова. – Минск, 2000. – Март. – С. 25–26.

3. *Курков, И.* Гендерные отношения в белорусской деревне (1921–1928 гг.) / И. Курков // Гендерные истории Восточной Европы: сб. науч. ст. / под ред. Е. Гаповой, А. Усмановой, А. Пето. – Минск: ЕГУ, 2002. – С. 198–208.

4. *Куркоў, І.* Жанчыны Беларусі «эпохі калектывізацыі» у дакументах ЦК КП(б)Б / І. Куркоў // ARCHE. – 1999. – № 3. – С. 213–217.

5. *Навіцкі, У.* Жанчына ў савецкім грамадстве: новы погляд на праблему / У. Навіцкі // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларуси. – Мінск, 1999. – С. 93–109.

6. *Дулов, А. Н.* Занятость в экономике Советской Беларуси в 1920–1930-е гг.: гендерный анализ / А. Н. Дулов // Веснік ВДУ імя П. М. Машэрава. – 2003. – № 4. – С. 39–44.

7. *Дулов, А. Н.* Работа и повседневная жизнь женщин в белорусской деревне во второй половине 1920-х – 1930-е гг. / А. Н. Дулов // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: материалы международной научно-теоретической конференции (30–31 октября 2003 г.). – Витебск: УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2003. – С. 323–326.

8. *Григорьев, Г. А.* Крестьянские общества взаимопомощи БССР: 1921–1930 гг. / Г. А. Григорьев. – Минск: Навука і тэхніка, 1993. – 110 с.

9. *Радчинская.* Значение вовлечения женщин в кооперацию / Радчинская // Кааперацыйнае жыццё. – 1926. – № 11–12. – С. 8–9.

10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. – Воп. 9.

11. Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР (1917–1927 гг.): сборник документов и материалов / сост. Т. А. Воробьева, Р. С. Васильева, Э. Л. Козловская [и др.]; редкол.: М. П. Костюк [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1980. – 310 с.

12. *Л.* Обеспечим здоровое воспитание смены / Л. // Беларуская работніца і сялянка. – 1929. – № 19. – С. 6.

13. *Ройзман, М.* Пра тое, што дарага для работніцы і сялянкі (Агляд зьвестак наконт ясель і пляцовак) / М. Ройзман // Беларуская работніца і сялянка. – 1927. – № 11. – С. 21.

14. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Фонд 10050-п. – Воп. 1.

15. *Хацкевіч, А.* Жанчына і новы быт / А. Хацкевіч. – Мінск: БДВ, 1930. – 56 с.

16. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМн). – Фонд 12-п. – Воп. 1.

17. *Барашка, І.* Нарысы з фронту калектывізацыі / І. Барашка // Маладняк. – 1930. – № 2. – С. 115–124.

18. Інтэрв’ю з Дзянісавай Е. І. ад 16.04.2002 // Асабісты архіў аўтара.

19. *Портнова, М. С.* Массово-политическая работа КПБ среди женщин белорусской деревни в 1929–1933 гг. / М. С. Портнова // Деятельность Компартии Белоруссии в период социалистического и коммунистического строительства: сб. науч. ст. – Минск: Изд-во БГУ, 1969. – С. 53–68.

**(Дата падачы: 20.02.2020 г.)**